# Краязнаўчае лата

Аўтары: Лабко Вераніка, Пятрушчык Рэната
Дзітвянская сярэдняя школа

# 1 раунд «У музеі»

| тэма | пытанне | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. **Хатні посуд** | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 2. **Прылады працы, інвентар** | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 3. **Адзенне, абутак** | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 4. **Мэбля, абсталяванне, інтэр’ер** | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |

# 1. Хатні посуд

*10 балаў*

***Сталовы прыбор, вялікая (аб'ём ад 100 мл і больш) разлівальная лыжка з доўгай ручкай. Выкарыстоўваецца для разлівання супоў, кампотаў, малака з посуду для прыгатавання (напр. каструлі) ў посуд для ўжывання ежы (талеркі, кубкі).***

**Адказ**

***апалонік***

# 1. Хатні посуд

*20 балаў*

***Гліняная пасудзіна з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі і звужаным горлам, ручкай і дзюбкай, прызначаная для захоўвання малака і малочных прадуктаў***

**Адказ**

*збан*

# 1. Хатні посуд

*30 балаў*

***Пасудзіна, пры дапамозе якой прасявалі муку***

**Адказ**

*Сіта*

# 1. Хатні посуд

***50 балаў***

***Карытападобная пасудзіна з шырокім адкрытым верхам, прызначаная для мыцця бялізны***

**Адказ**

***Начоўкі (ночвы)***

# 1. Хатні посуд

*70 балаў*

***Ёмістасць для захоўвання і пераноскі сыпучых прадуктаў (збожжа, мукі, круп, гароху і інш.), сплеценая з лубу, саломы, лазы. Мелі канфігурацыю збанка, бочкі, гаршка, часта іх рабілі з вечкам. Мелі добрую вентыляцыю, таму ў іх нядрэнна захоўваліся прадукты.***

**Адказ**

***кораб***

# 2. Прылады працы, інвентар

*10 балаў*

***Пры дапамозе гэтай прылады жалі жыта, ячмень***

**Адказ**

***Серп***

# 2. Прылады працы, інвентар

*20 балаў*

***Прылада, з  дапамогай якой малацілі зерне***

**Адказ**

***цэп***

# 2. Прылады працы , інвентар

*30 балаў*

***Ткацкі станок для выррабу тканін ў хатніх умовах***

**Адказ**

***Кросны***

# 2. Прылады працы, інвентар

***50 балаў***

***Бандарны выраб, пасудзіна для збівання масла***

**Адказ**

***Маслабойка***

# 2. Прылады працы, інвентар

*70 балаў*

***Самапрадка, прылада для механічнага прадзення лёну***

**Адказ**

***Калаўрот***

# 3. Адзенне, абутак

*10 балаў*

***Традыцыйны сялянскі абутак, плецены з лыка (лазовага, ліпавага), пяньковых або льняных вітушак ці тонкіх вяровак***

**Адказ**

***Лапці***

# 3. Адзенне, абутак

*20 балаў*

***Мужчынскі саламяны галаўны ўбор, які добра засцерагаў ад сонца***

**Адказ**

***Капялюш (брыль)***

# 3. Адзенне, абутак

*30 балаў*

***Галаўны ўбор замужняй жанчыны***

**Адказ**

*хустка*

# 3. Адзенне, абутак

*50 балаў*

***Верхняя зімовая  з аўчыны вопратка, насілі як жанчыны, так і мужчыны***

Адказ

*кажух*

# 3. Адзенне, абутак

*70 балаў*

***Пэўнага крою жаночая адзежа, якую надзяваюць спераду на сукенку, спадніцу, каб засцерагчы іх ад забруджвання***

**Адказ**

*фартух*

# 4. Мэбля, абсталяванне, інтэр’ер

*10 балаў*

Ахоўніца ачага, «гаспадыня». Зранку вясковыя кабеты ўжо завіхаліся ля яе, ставілі ў яе чыгуны і чыгункі з ежай

**Адказ**

***печ***

# 4. Мэбля, абсталяванне, інтэр’ер

*20 балаў*

***Мэбля, якая стаяла ўздоўж сцен, на ёй звычайна сядзелі, маглі і спаць, калі збіралася шмат гасцей***

**Адказ**

*лава*

# 4. Мэбля, абсталяванне, інтэр’ер

*30 балаў*

***Драўляная скрыня для захоўвання тканін, адзення і каштоўнасцяў, нярэдка аздаблялася мастацкім роспісам***

**Адказ**

*куфар*

# 4. Мэбля, абсталяванне, інтэр’ер

*50 балаў*

***Ручная прылада для вызначэння вагі***

**Адказ**

*бязмен*

# 4. Мэбля, абсталяванне, інтэр'ер

*70 балаў*

***Самае святое і шанаванае месца ў хаце, тут сядзелі кум з кумою ( на хрысцінах), маладыя (на вяселлі)***

**Адказ**

***покуць***

# 2 раунд

| тэма | пытанне | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1.СМІ Лідчыны | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 2. Летапіс горада | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 3. Эканоміка | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 4. Знакамітыя Лідзяне | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |

# 1. СМІ

*10 балаў*

***Назавіце рэкламна -інфармацыйную газету Лідскага раёна, якая выходзіць з 1999 года***

**Адказ**

***газета “Прынёманскія весткі”***

# 1. СМІ

*20 балаў*

***Лідчына выпускае свой краязнаўчы часопіс . Як называецца дадзенае выданне?***

**Адказ**

***часопіс “Лідскі летапісец”***

# 1. СМІ

*30 балаў*

***У якім годзе выйшаў першы нумар Лідскай газеты?***

**Адказ**

*у 1939 г.*

# 1. СМІ

*50 балаў*

***Хто з'яўляецца галоўным рэдактарам Лідскай газеты сёння?***

**Адказ**

***Кацярына Іванаўна Серафімовіч***

# 1. СМІ

*70 балаў*

***Як называлася Лідская газета першапачаткова?***

**Адказ**

*газета “Уперад”*

# 2. Летапіс горада

*10 балаў*

***Назавіце год заснавання горада Ліда***

**Адказ**

*1323 год*

# 2. Летапіс горада

*20 балаў*

***Хто лічыцца заснавальнікам нашага горада?***

**Адказ**

***князь Гедымін***

# 2. Летапіс горада

*30 балаў*

***Вы згодны са сцвярджэннем, што герб нашага горада не заўсёды быў такім, як сёння?***

**Адказ**

згодны

# 2. Летапіс горада

*50 балаў*

***Ці згодны вы са сцвярджэннем, што горад Ліда атрымаў Магдэбургкае права і гарадскі герб у 1500 годзе?***

**Адказ**

*не, у 1590 годзе*

# 2. Летапіс горада

*70 балаў*

*У горадзе Ліда ёсць вялікая колькасць помнікаў. І ўсё ж, на дадзены момант аб' яўлены конкурс на лепшы эскізны праект будучай скульптуры. Што за помнік плануецца ўстанавіць?*

Адказ

*помнік Гедыміну*

# 3. “Моўныя залацінкі”

*10 балаў*

***Што абазначала слова «гута»?***

**Адказ**

*шклозавод*

# 3. “Моўныя залацінкі”

*20 балаў*

***Што абазначала слова «бровар»?***

**Адказ**

***піўзавод***

# 3. “Моўныя залацінкі”

*30 балаў*

***Што абазначала слова «валіска»?***

**Адказ**

***чамадан***

# 3. “Моўныя залацінкі”

*50 балаў*

***Хто такі бортнік?***

**Адказ**

***пчаляр***

# 3. “Моўныя залацінкі”

*70 балаў*

***На якой фабрыцы нашага горада можна пачуць слова «халява»?***

**Адказ**

*абутковая фабрыка*

# 4. Эканоміка

*10 балаў*

***Дадзенае прадпрыемства спецыялізіруецца на выпуску аптычнага шкла, вырабаў геаметрычнай оптыкі. Што гэта за прадпрыемства?***

**Адказ**

*завод “Оптык”*

# 4. Эканоміка

*20 балаў*

***Назавіце самае старэйшае прадпрыемства па вытворчасці сельскагаспадарчых машын.***

**Адказ**

***завод “Лідсельмаш”***

# 4. Эканоміка

*30 балаў*

***Нядаўна завод «Лідахарчканцэнтраты» адзначыў свой 50 – гадовы юбілей. Вы згодны з дадзеным сцвярджэннем?***

**Адказ**

***Не згодны , завод адзначыў 70- гадовы юбілей***

# 4. Эканоміка

***50 балаў***

***Лідская абутковая фабрыка даволі старое прадпрыемства ў нашым горадзе. Якую назву мела дадзеная фабрыка першапачаткова?***

**Адказ**

***фабрыка "Ардаль"***

# 4. Эканоміка

*70 балаў*

***Дэліс-стыль - гэта фабрыка, якая ўваходзіць у 5 лепшых прадпрыемстваў па вытворчасці шкарпетачных і панчошных вырабаў РБ. Дзе знаходзіцца дадзенае прадпрыемства?***

**Адказ**

***вёска Астроўля***

# 3 раунд

| тэма | пытанне | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. Культура | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 3. Архітэктура і скульптура | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |
| 4. Людзі зямлі Лідскай | 10 | 20 | 30 | 50 | 70 |

# 1. Культура

*10 балаў*

***Назавіце імя ганаровага грамадзяніна горада Ліда, які вядомы як мастак, паэт і скульптар***

Адказ

*Рычард Груша*

# 1. Культура

***20 балаў***

***Як называецца народны ансамль яўрэйскай музыкі ў нашым горадзе?***

**Адказ**

***ансамбль “Шалом”***

# 1. Культура

*30 балаў*

***Ці згодны вы са сцвярджэннем, што народны ансамбль песні і танца «Лідчанка» існуе з красавіка 1961 года?***

**Адказ**

***так, ансамбль існуе з 1961 года***

# 1. Культура

***50 балаў***

***Нават сёння іграюць на тых скрыпках, якія ў свой час зрабіў народны ўмелец Браніслаў Паўлавіч Круглы. На сваёй маленькай Радзіме майстар пражыў усё жыццё. Назавіце вёску, дзе жыў і «выпраўляў у свет» свае скрыпкі майстар?***

**Адказ**

***вёска Дубчаны Тарноўскага сельскага Савета***

# 1. Культура

*70 балаў*

***Што размясцілася ў паўднёва-заходняй вежы Лідскага замка ў пачатку яе пабудовы і да 1533года?***

**Адказ**

***праваслаўная царква***

# 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах

*10 балаў*

***Вы згодны з тым, што плошча Лідскага раёна займае прыкладна 1567 км квадратных?***

**Адказ**

***плошча прыкладна 1567 кіламетраў квадратных***

# 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах

*20 балаў*

***Назавіце асноўны тып рэльефа Лідчыны***

**Адказ**

*асноўны тып - Лідская раўніна*

# 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах

*30 балаў*

***Вы згодны са сцвярджэннем, што плошча раёна займае 3 месца па велічыні ў Гродзенскай вобласці?***

**Адказ**

*Лідскі раён займае 5 месца па велічыні*

# 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах

*70 балаў*

***Як называецца нізіна, якая знаходзіцца ў межах Лідскага раёна?***

**Адказ**

***Нёманская нізіна***

# 2. Лідчына ў геаграфічных фактах і лічбах

***50 балаў***

***У Лідскім раёне ў 2017 годзе адкрыты рэгіянальны лясны адукацыйны цэнтр. Дзе знаходзіцца дадзены цэнтр?***

**Адказ**

***вёска Гарні***

# 3. Архітэктура і скульптура

*10 балаў*

***У нашым горадзе вялікая колькасць скульптур. Адна з іх на скрыжаванні вуліц Ленінскай і праспекта Перамогі. Што за скульптура?***

**Адказ**

***скульптура з выявай ільва з ключамі ад горада***

# 3. Архітэктура і скульптура

*20 балаў*

***Дзе знаходзіцца ў нашым горадзе  помнік Францыску Скарыну?***

**Адказ**

***вуліца  Савецкая, каля касцёла***

# 3.Архітэктура і скульптура

*30 балаў*

***У якім населеным пункце захаваліся рэшткі вадзянога млына, які ў хуткім часе стане турыстычным аб'ектам?***

**Адказ**

*аграгарадок Дворышча*

# 3. Архітэктура і скульптура

*50 балаў*

***Незвычайны маёнтак знаходзіцца ў аграгарадку Тарнова. Пра якога графа, уладара будынка, ідзе размова?***

**Адказ**

*граф Дзітрый Маўрас*

# 3. Архітэктура і скульптура

*70 балаў*

***Святая крыніца. Так пра яе гавораць у наваколлі вёскі Лебяда. У гонар якога святога была асвечана крыніца?***

**Адказ**

*Іаанава крыніца*

# 4. Людзі зямлі Лідскай

*10 балаў*

***Вы згодны з тым, што на сённяшні дзень у нашым горадзе пражывае да 100 000 жыхароў***

**Адказ**

*у горадзе Ліда больш за 100 000 жыхароў*

# 4. Людзі зямлі Лідскай

*20 балаў*

***Імем гэтага паэта названы філіял Лідскага гісторыка-мастацкага музея ў горадзе Ліда, што знаходзіцца ля замка. Хто гэта?***

**Адказ**

*Валянцін Таўлай*

# 4. Людзі зямлі Лідскай

*30 балаў*

***Пісьменніца, ураджэнка вёскі Хадзюкі, яе апавяданне «Касцы» вывучаецца ў 6 класе. Хто гэта?***

**Адказ**

*Хрысціна Лялько*

# 4. Людзі зямлі Лідскай

***50 балаў***

***Наш зямляк – ганаровы грамадзянін Чылі, у гонар якога названы горны хрыбет, два мінералы. Хто гэта?***

**Адказ**

***Ігнат Дамейка***

# 4. Людзі зямлі Лідскай

*70 балаў*

***Пісьменніца, нарадзілася ў вёсцы Біскупцы ў 1938 годзе, настаўнічала, некаторы час з'яўлялася дырэктарам музея Максіма Багдановіча ў г. Гродна***

**Адказ**

***Данута Бічэль-Загнетава***

# Падвядзенне вынікаў

